ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
13 ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 30 (1294)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## "Беларускі універсітэт" ТЭЛЕТАЙП

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

**кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў на гэты раз прайшло на Мінскім заводзе халадзільнікаў.**

**Выкладчыкі універсітэта выступілі з лекцыямі «КПСС ва ўмовах развітога сацыялізму», «Кітай сёння», «Аб міжнародным становішчы», «Ідэалагічная барацьба і моладзь» і інш. Потым адбылася змястоўная гутарка з членамі парткома завода.**

**Кіраўніцтва завода арганізавала для гасцей экскурсію па вытворчасці.**

**А. КАРАЧУН,**
**старшы лабарант кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.**

### КАЛЕКТЫЎНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

**студэнтаў вучэбнай літаратурай паспяхова завершана. У гэтым годзе супрацоўнікі бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна забяспечылі 250 груп студэнтаў дзённага аддзялення 84000 экземплярамі кніг. У мінулым годзе такой жа колькасці груп студэнтаў было выдадзена 48859 экземпляраў вучэбнай літаратуры.**

**І. БАРДЗІЯН.**

### ПРАВОДЗІЦЦА II ТУР

**рэспубліканскага агляду-конкурсу факультэтаў і кафедр універсітэта па выкарыстанню ў вучэбным працэсе тэхнічных сродкаў і вылічальнай тэхнікі.**

**Вынікі агляду будуць абмеркаваны на пасяджэннях саветаў факультэтаў і кафедр.**

**М. НІКІЦЕНКА,**
**старшы інспектар вучэбнага аддзела.**

### СТУДЭНЦКІ НАВУКОВЫ

**савет хімічнага факультэта правёў экскурсію для вучняў школ горада Мінска па лабараторыях факультэта.**

**Маладыя вучоныя — супрацоўнікі лабараторый растлумачылі мэты і метады сваіх навуковых работ, расказалі аб народнагаспадарчым значэнні даследаванняў.**

**На сходзе навуковага таварыства хімфака быў прыняты план работы на гэты навучальны год. Выкананне яго дапаможа павялічыць колькасць малодшакурснікаў, якія займаюцца ў СНТ, і колькасць дакладаў на XXXIX студэнцкай навуковай канферэнцыі.**

**А. ВЕЧАР,**
**член камітэта камсамола хімфака.**

# АВАЛОДВАЙЦЕ МАЙСТЭРСТВАМ ПЕРАКОНВАЦЬ

ДАЗВОЛЮ САБЕ выказаць катэгарычнае меркаванне: «ахілесавай пятой» сённяшняга выпускніка ВНУ, які валодае значнай тэарэтычнай падрыхтоўкай, з'яўляецца яго няўменне наладзіць на практыцы рэальны вытворчы працэс, хутка адаптавацца ў калектыве, працаваць з людзьмі. Як жа зацікавіць будучага спецыяліста майстэрствам аналізу чалавечых адносін, уменнем ствараць аптымальныя спрыяльныя ўмовы ў калектыве для высокавытворчай працы? Якія «ключы» падабраць, каб «адкрыць» дзверы, што вядуць да таямніц педагагічнага майстэрства, да ўмення праводзіць заняткі ў школах перадавога вопыту, гуртках і семінарах сістэмы палітычнай адукацыі, да гатоўнасці выступіць перад калектывам з лекцыяй, дакладам або проста пагутарыць з чалавекам аб тым, што набалела?

Важнейшую ролю ва ўзбраенні студэнтаў тэорыяй і методыкай камуністычнай прапаганды, у выпрацоўцы практычных навыкаў агітацыйна-масавай дзейнасці адыгрывае створаная ва універсітэце школа маладога лектара. У мінулым годзе ў ёй займалася 225 чалавек, у гэтым годзе плануецца павялічыць састаў яе слухачоў да 400.

Перад маладымі лектарамі выступаюць вучоныя універсітэта, партыйныя і камсамольскія работнікі, вядомыя майстры слова. Акрамя лекцый, у школе практыкуюцца і іншыя формы заняткаў: семінары, гутаркі, дыспуты, кансультацыі, рэцэнзіраванне і абмеркаванне падрыхтаваных слухачамі рэфератаў. Заканчваецца навучальны год канферэнцыяй. У красавіку гэтага года мы правялі першую агульнауніверсітэцкую навукова-практычную канферэнцыю слухачоў школы маладога лектара, прысвяціўшы яе 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Вялікую цікавасць ва ўсіх слухачоў выклікалі лекцыі на тэмы: «У. І. Ленін аб ролі настаўніка ў савецкім грамадстве», «Аб перспектывах выкарыстання ЭВМ у тэхнічным прагрэсе», «Фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі моладзі — важнейшая задача камуністычнага выхавання», «XXII Алімпійскія гульні ў Маскве — свята спорту, дружбы і міру». Вынікі канферэнцыі паказалі, што ў школе маладога лектара студэнты паспяхова засвойваюць асноўныя прынцыпы падрыхтоўкі і правядзення публічных выступленняў, вучацца аргументавана і ў той жа час папулярна выкладаць актуальныя праблемы грамадскага жыцця.

Веды, якія набыты на лекцыях і семінарскіх занятках школы маладога лектара, пастаянна папаўняюцца, слухачы прымяняюць іх у працэсе самастойнай работы. Падрыхтаваныя нашымі маладымі лектарамі рэфераты і даклады заслухоўваюцца ў студэнцкіх групах, інтэрнатах. Выступленні з лекцыямі, дакладамі, палітінфармацыямі, гутаркамі перад аўдыторыяй у перыяд вытворчай практыкі, на сельгасработах, у час «зорных паходаў», у падшэфных школах, гаспадарках, на прадпрыемствах — вельмі добрая форма праверкі і замацавання метадаў і навыкаў лекцыйна-прапагандысцкай работы.

У гэтым навучальным годзе мы запрашаем усіх, хто жадае авалодаць самым старажытным і нялёгкім з майстэрстваў — прамоўніцкім, лектарска-прапагандысцкім, — у адну з дзевяці секцый школы маладога лектара.

Кіруюць секцыямі школы вопытныя выкладчыкі. Выклікае заклапочанасць толькі секцыя падрыхтоўкі лектараў па філасофскіх ведах, кіраўніцтва якой кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў «пераклала» на аспіранта, не аказваючы дапамогі і не кантралюючы яго работу.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў, дэканат ФГП, партыйныя і камсамольскія арганізацыі ўсіх факультэтаў павінны прыняць належныя меры, каб павысіць эфектыўнасць работы кожнай секцыі, зрабіць усё, каб школа маладога лектара была школай грамадзянскага і прафесійнага станаўлення пачынаючых прапагандыстаў, агітатараў і палітінфарматараў, будучых спецыялістаў.

**А. КОТАЎ,**
**кіраўнік школы маладога лектара, дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.**

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# НАВУКА АДКРЫВАЕ ТАЯМНІЦЫ

...НА КАНФЕРЭНЦЫІ Ў МАСКВЕ, дзе праходзіла выстаўка па навуковаму прыладабудаванню, прадстаўнік адной з вядучых у свеце фірм па прыладабудаванню «Варыан» (еўрапейскі філіял амерыканскай фірмы) зацікавіўся адной з прадстаўленых тут прылад па магнітарэзананснай спектраскапіі. Апарат у адрозненне ад іншых узораў вызначаўся сваім нізкім коштам, высокай ступенню аўтаматызацыі, невялікім размерам і па сваіх параметрах не ўступаў лепшым замежным.

Гэтая прылада, так здзівіўшая сваёй партатыўнасцю, «макетнасцю» заходняга спецыяліста, была распрацавана вучонымі кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі БДУ імя У. І. Леніна. Спектрометры электроннага парамагнітнага рэзанансу, створаныя групай фізікаў пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры прафесара С. С. Шушкевіча, па шэрагу параметраў пераўзыходзяць лепшыя замежныя аналагі. Кампактнасць, высокая надзейнасць прылад, распрацаваных для эксплуатацыі як у стацыянарных, так і палявых умовах, у спалучэнні з іншымі якасцямі робяць іх даступнымі для вырашэння вя-

**(Працяг на 2-й стар.).**



**На здымку:** малодшы навуковы супрацоўнік **Л. Файбышаў.**

# ГАЛОЎНАЕ—УЗАЕМАДАПАМОГА

**Ва ўмовах развітога сацыялізму ўзрастае сацыяльна-палітычная роля вышэйшай школы, у дзейнасці якой значнае месца павінен займаць факультэт грамадскіх прафесій. Як ён дапамагае студэнтам авалодваць другой (грамадскай) спецыяльнасцю, садзейнічае развіццю сацыяльнай актыўнасці студэнцкай моладзі ў ідэйна-выхаваўчай, культурна-масавай, спартыўнай, ваенна-патрыятычнай рабоце сярод насельніцтва, мы і папрасілі расказаць дэкана ФГП У. В. ПУЗІКАВА і прарэктара па вячэрняму і завочнаму навучанню У. С. БАГДАНАВА.**

**У. В. ПУЗІКАЎ:**—За час існавання факультэта грамадскіх прафесій (з 1964 года) у яго развіцці назіраюцца перыяды спаду і пад'ёму. Чарговы перыяд актывізацыі работы пачаўся ў 1977 годзе пасля аналізу дзейнасці факультэта на пасяджэнні бюро камітэта камсамола універсітэта. Фактычна з гэтага часу факультэт грамадскіх прафесій універсітэта стаў аднаўляцца. Прычым складанасць рашэння гэтай задачы заключаецца ў тым, што даводзілася, на жаль, пераадольваць прадузятасць, раўнадушша і нават нядбайныя адносіны да ФГП як з боку студэнтаў, так і з боку асобных кафедр, дэканатаў і грамадскіх арганізацый.

**У. С. БАГДАНАЎ:**—У рабоце ФГП ёсць сур'ёзныя недахопы. У 1979—1980 навучальным годзе толькі 6 працэнтаў студэнтаў універсітэта набылі другія спецыяльнасці. Нездавальняюча праводзіцца набор слухачоў, неабгрунтавана мяняліся кіраўнікі аддзяленняў і секцый. Кафедры універсітэта, закліка
ныя забяспечваць вучэбны працэс на ФГП, не аказвалі патрэбнай дапамогі дэканату ў складанні вучэбных планаў і праграм, не здзяйснялі кантроль за работай сваіх выкладчыкаў. У сваю чаргу дэканат не праяўляў патрэбнай настойлівасці пры рашэнні пытанняў матэрыяльнага забеспячэння факультэта, адсутнічала сістэма справаздачнасці кіраўнікоў аддзяленняў і секцый.

**— Якая ж методыка правядзення заняткаў таго ці іншага аддзялення?**

**У. В. ПУЗІКАЎ:**— Заняткі праводзяцца ў адпаведнасці з вучэбным планам і праграмамі, распрацаванымі на аснове прыкладных планаў Мінвуза БССР, Міністэрства культуры рэспублікі, дамоў народнай творчасці. На лектарска-прапагандысцкім аддзяленні слухачамі распрацоўваюцца тэксты лекцый, з якімі яны потым выступаюць перад насельніцтвам, у вучэбных групах. Слухачы аддзялення мастацкага слова і харэаграфіі прымалі ўдзел у канцэртах, а слухачы аддзяленняў суддзяў і інструктараў па спорту здзяйсняюць судзейства на агульнауніверсітэцкіх спаборніцтвах.

Узаемасувязь тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі слухачоў факультэта дазваляе ім актыўна ўдзельнічаць у рабоце народнага ансамбля «Крыжачок», студэнцкага тэатра. Арганізавалі выстаўкі сваіх работ фотакарэспандэнты і мастакі-афарміцелі. Слухачы школы маладога лектара правялі ў мінулым годзе канферэнцыю, прысвечаную 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Студэнты, якія займаюцца на ФГП, накіроўваюцца камітэтам камсамола ў саставе педагагічных атрадаў у падшэфныя школы і домакіраўніцтвы для арганізацыі гурткоў па розных відах творчасці.

Вучэбны працэс у 1979—1980 навучальным годзе забяспечваўся сіламі 60 чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта. Запрашаліся лектары таварыства «Веды», слухачы ІПК пры БДУ, работнікі мастацтва і культуры.

**— Матэрыяльная база факультэта задавальняе?**

**У. В. ПУЗІКАЎ:**— У распараджэнні кіраўнікоў аддзяленняў для правядзення заняткаў знаходзіцца два магнітафоны, тры прайгравальнікі. Дэканат хімічнага факультэта заўсёды ідзе насустрач пры забеспячэнні хімрэактывамі аддзяленняў фотакарэспандэнтаў і кінаапаратараў. Кафедра археалогіі выдзеліла на часовае карыстанне кінакамеру «Кіеў-16». Аддзел забеспячэння часткова задавальняе патрабаванні аддзялення мастакоў-афарміцеляў.

**— Што робіцца па арганізацыі набору слухачоў? Якія ўзнікаюць пры гэтым цяжкасці?**

**У. В. ПУЗІКАЎ:**— Асноўную работу па набору праводзяць камсамольскія арганізацыі факультэтаў. Аб'яднанне дзейнасці дэканата і камітэтаў камсамола ўжо дае свае станоўчыя вынікі. Калі ў 1978-79 навучальным годзе на факультэце працавала 8 аддзяленняў, на якіх займалася 547 чалавек, то ў мінулым годзе планавалася набраць 700 чалавек на 10 аддзяленняў. У выніку работы, праведзенай дэканатам і факультэцкімі камсамольскімі арганізацыямі, было пададзена 734 заявы. Пасля правядзення субяседаванняў адборачныя камісіі прадставілі на залічэнне спісы 455 студэнтаў універсітэта. Разам з перайшоўшымі на другі год навучання колькасць слухачоў факультэта склала 728 чалавек. Аднак такая колькасць слухачоў факультэта грамадскіх прафесій не адпавядае маштабам універсітэта.

Што датычыць цяжкасцей з наборам, то яны узнікаюць у сувязі са спецыфікай аддзяленняў. Напрыклад, у мінулым годзе на аддзяленне мастацкага слова не набралі слухачоў, якія б спалучалі навыкі кіраўніка з талентам выканаўцы. На аддзяленні харэаграфіі прыём абмежаваны адсутнасцю формы для рэпетыцый.

**— Чым абумоўлены недахопы ў рабоце ФГП?**

**У. С. БАГДАНАЎ:**— Амаль штогод на факультэце мяняюцца кіраўнікі аддзяленняў, секцый. Кафедрамі несвоечасова было выканана распараджэнне рактарата аб выдзяленні кіраўнікоў секцый для школы маладога лектара. Толькі пасля неаднаразовых напамінанняў з боку рэктарата і парткома загадчыкі кафедр рашылі пытанне. Але, як паказала практыка, — фармальна. Фактычна не прыступілі да выканання абавязкаў кіраўнікоў секцыі выкладчыкі М. І. Вішнеўскі (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў), М. А. Ермаліцкі (кафедра навуковага камунізму), А. І. Гавура, А. А. Кузьмічоў (кафедра палітэканоміі).

**Такім чынам, асноўная праблема заключаецца ў тым, каб звярнуць увагу дэканатаў факультэтаў і кіраўнікоў іншых падраздзяленняў універсітэта на аказанне ўсебаковай дапамогі ФГП у арганізацыі вучэбнага працэсу.**

Інтэрв'ю правяла
**Н. ЖУКАВА.**



# НАВУКА АДКРЫВАЕ ТАЯМНІЦЫ

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й і 2-й стар.).**

ных выстаўках у Балгарыі, Індыі, Маскве, Мінску і адзначаны пяццю залатымі, сярэбранымі і бронзавымі медалямі. Дастойную ўзнагароду — бронзавы медаль атрымала на ВДНГ СССР у 1979 годзе партатыўная аўтаматычная метэастанцыя, якую распрацавала група фізікаў пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка У. А. Чудакова. Што ж гэта за прылада, якое яе прызначэнне?

Уявіце сабе невялікі апарат, які даволі лёгка змяшчаецца нават у рукзаку; акрамя таго, яго можна ўстанавіць у цяжкадаступных месцах і пры любых умовах надвор'я. Аўтаматычная метэастанцыя з лічбавымі вымяральнікамі гідралагічнай інфармацыі і выхадам іх у абсалютных адзінках у кодзе ЭВМ служыць для вывучэння біясферы, а таксама палявой радыёметрыі атмасферных ападкаў з мэтай аховы і прагназіравання навакольнага асяроддзя. Станцыя вымярае дзевяць параметраў, і адразу ж адлюстроўвае іх. Адначасова адбываецца кантроль і запіс у лічбавай форме на магнітную стужку.

На кафедры пад кіраўніцтвам прафесара У. Р. Барышэўскага, створаны новы навуковы напрамак: ядзерная оптыка палярызаваных асяроддзяў. І, у прыватнасці, распрацаваны новыя метады генерацыі цвёрдага і гама-выпраменьвання ў крышталях. Важнасць гэтага навуковага напрамку пацвярджаецца адкрыццём У. Р. Барышэўскага ў галіне ядзернай фізікі «З'ява ядзернай прэцэсіі спіна нейтронаў»

Навука раскрывае свае таямніцы перад чалавекам. Эксперыменты, вопыты працягваюцца. І можна смела ўявіць, што зараз у адной з лабараторый кафедры ядзернай фізікі нараджаецца новае адкрыццё...

**С. ІВАНОВА.**

**НА ЗДЫМКАХ: у лабараторыі ядзернай оптыкі працуе старшы навуковы супрацоўнік В. Еўдакімаў; праводзіцца рэгуліроўка праграмы для матэматычнай апрацоўкі фізічнага эксперыменту; пяцікурснік фізічнага факультэта А. Фёдараў і тэхнік У. Семілетаў рыхтуюць вакуумную ўстаноўку для атрымання газавых сумесей.**

**Фота М. ДУБОВІКА.**



**З НАШАЙ ПОШТЫ**

# «ДЗЯКУЙ, СЯБРЫ!»

У ПЕРАПЫНКУ паміж лекцыямі калідор нашага факультэта напаўняецца шумам і разнагалоссем. Вось аб нечым ажыўлена гутараць Хуан з В'етнама, афганец Хадзі, Касім з Йемена. Гэтыя рабяты прыехалі з розных канцоў зямлі, а сустрэліся тут, у Мінску, і пасябравалі. Дапамагае іх зносінам і дружбе руская мова, сапраўды міжнародная мова. Памятаю той нядаўні час, калі я не ведаў па-руску ніводнага слова. А зараз я магу размаўляць, пісаць, чытаць. І ва ўсім гэтым, чаго я дасягнуў сёння, дапамаглі мне савецкія сябры, студэнты, якія займаюцца разам са мной. З аднымі я жыву ў пакоі інтэрната, іншыя прыходзяць да мяне ў госці. Кожнае пытанне, якое мяне цікавіць, заўсёды тлумачаць мне рускія рабяты. Мы размаўляем на розныя тэмы. І гэта дапамагае ў вывучэнні рускай мовы, расшырае мой кругагляд.

Сесія — асаблівы перыяд у нашым студэнцкім жыцці. А вывучаць даводзіцца складаныя прадметы: філасофію, палітэканомію, літаратуру... І ў такі час заўсёды прыемна мець верных таварышаў. Мае савецкія сябры ніколі не адмаўляюць у дапамозе, растлумачваюць незразумелае.

Зараз я вучуся на ІІ курсе. І ў гэтым вялікая заслуга маіх савецкіх сяброў.

**ХАЛДЗІ НУР,
студэнт журфака.**

# РУЖОВЫ РАНАК

Літаратурная старонка

**ЛІЛІЯ МАТУСЕВІЧ**

## СЫНУ РУСЛАНУ

Сын кранае гітарныя струны —
Вее цнотаю модны матыў.
І я чую фальцэт яго юны,
Дзе каханне, як снежны
матыль.
І матыль той лунае над поўняй,
Ў сэрцы сына ўздымаючы шал.
Ён, як мара, жыццё сына
поўніць;
Без яе зледзянее душа.

Мо любві зямной белыя крылы
Ў Новы год нясе ёлкі краса?
А мо пальмам на вокнах
застылых,
Як і струнам, агонь выкрасаць?
Той агеньчык займаецца
ў сэрцы,
Снег яна з матыля абтрасе.
Прадчуванне пяшчоты ліецца,
Ды прачнецца матыль у расе.

## БЕЛАЯ РУСЬ

Разбудзі, сонца, ў гнёздах
Птушак на белых таполях,
Асвяці на барознах
Цвет бульбянога поля.

Павісь белых туманаў
Здуе ветрык-гармонік —
Нам адкрыецца раннем
Востраў белых рамонкаў.

Гляне ў белы бярэзнік
Промень цёплы, празрысты,
І бярозкі гарэзна
Затанцуюць на выспах.

Над вадой белы бусел
Распасцёр свае крылы,
Белы птах Белай Русі —
Крылы рэкі бялілі.

Сонца ліла свет новы,
На душы стала бела,
Ды ў садзе вясновым —
Маё сэрца замлела.

А зімой у Белай Русі —
Заінелае ранне,
Белым дрэвам дзіўлюся,
Жыву шчодрым каханнем.



Зіма прыйшла...

Фотаэцюд М. Дубовіка.



**ДЗМІТРЫЙ НОВІКАЎ**

## ДОЖДЖ

**Прысвячаецца Яўгеніі Янішчыц**

Мусіць, яно так і трэба:
Сёння ў зарнічны час
З шэрага жбана неба
Выліўся сіні квас.
Водар цадзіўся густа.
Долу пітво цякло.
Прагна раскрыўшы вусны,
Поле яго піло.
Гай падстаўляў далоні,
А за яго спіной
Радаваліся гоні
Слодычы незямной.
Пара вілася пенна...
Лаяўся дзед Фама:
«Зноў замачыў мне сена,
Каб на яго чума!»

* * *

Ржышчам ацацінілася пожня.
Сенажаць гарбаціцца стагамі.
На пагорку прымасціўся
дожджык,
Звесіўшыся доўгімі нагамі.
Жоўценню запэцканы канавы
Ля дарог, забітых граззю
клейкай.
На ўзлеску клён, як цвік
іржавы,
Утыкнуўся ў лубін-самасейку.
Сінія азёры спахмурнелі.
Выгнуліся хвалі абаранкам.
І па днях, што сонцам
адзвінелі,
Плачуць журавы халодным
ранкам.
Плачуць так, што боль
у хмары б'ецца.
Жаляцца ў засмучаную
просінь.
І шчыміць да дрыжыкаў пад
сэрцам:
Восень... Восень...

## ЗАЖЫНКІ

Ловіць ранак ружовым волакам
Зоркі-рыбы ў нябеснай вадзе.
З-за кудлатасці шэрых воблакаў
Прамяністае сонца ідзе.

Разганяе туманы белыя.
П'е духмяністую расу.
На зялёных лугах высцельвае
Залатых валасоў красу.

Неба сонцу сягоння цеснае.
На зямлю цеплыня цячэ.
Камбайнёры гамоняць весела:
«З сонцам будзе касіць ямчэй».

Важкасць ёсць у пракосе спробным!
Зерня ў бункеры — цераз край!
Будзе, будзе на сонца падобны
Хлеба першага каравай!

* * *

Сад спавіты ціхай ноччу,
Быццам коўдраю дзіця.
Яблыкі глядзяць, як вочы,
З-пад зялёных вейк лісця.

У чаромсе ля павеці —
Камарыны тонкі плач.
Як старыя дзверы ў клеці,
Дзесьці ў полі скрыпнуў драч.

На малінніку кудлатым —
Пара, быццам сырадой,
Вее скошанаю мятай
І гаркавай лебядой.

Ад дрыготкіх пахаў п'яны,
Вісне месяц на суку...
Спора цягне скрозь туманы
Жнівень верасню руку...

* * *

Асенні шэры дзень, як
дрэнны сон,
Пячаткі суму ставіць на асінах.
І карканне абрыдлае варон
Заблыталася ў голых
вершалінах.

Ад вільгаці сасоннік стаў сівы.
Палеткі лістапад дажджом
засланіў.
За што ж цалуюць неба
арабіны
Нязлічанасцю вуснаў агнявых?..

**САТЫРЫЧНЫМ ПЯРОМ**

# ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ

У СТУДЭНЦКІМ ЦАРСТВЕ стаяла хатка. Ды не адна. Ажно цэлых восем! І стаялі яны не на курыных нагах, а на магутных падмурках. І называліся яны інтэрнатамі. А жылі ў іх студэнты — народ вясёлы. Жылі — не сумавалі. Адны хадзілі на лекцыі, другія пільнавалі інтэрнатаўскі спакой, трэція ўладкоўвалі асабістае жыццё — сустракаліся з выдатніцамі вучобы ці чакалі ля акенца якога-небудзь прынца заморскага. Чацвёртыя проста адпачывалі, аглушаючы паверхі стэрэафанічным свістам. Не баяліся студэнты нікога. Нават сесію перамагалі. Ды яшчэ як!

Адным словам, жылі добра. Радаваліся ўсяму: сонейку, дажджу і... стыпендыі. Было б ладна і выдатна зусім, калі б не паявіўся ў бугалтэрыі даўжэзны спіс асоб, якія не заплацілі за сваё ўтульнае інтэрнатаўскае жыллё. І зрабілі яны гэта не таму, што больш падабаецца ім жыць за 40 рублёў у месяц на кватэры, а здаецца, зусім з іншай прычыны. Здагадаліся? Так, няма ў іх сумлення. Не хапае яго нават на такую дробязь, як 2 рублі 10 капеек. Не жадаюць плаціць, і ўсё. Тыдзень не жадаюць, семестр, нават год.

І самае непрыемнае тое, што адбываецца гэта не ў казцы, а ў жыцці. Спіс гэты — факт, дакумент. Ён рэальнасць. Толькі за адзін семестр мінулага навучальнага года з 6 тысяч студэнтаў, якія жылі ў васьмі інтэрнатах універсітэта, 420 не пажадалі заплаціць грошы. Уяўляеце? А калі не ўяўляеце, то займіцеся арыфметыкай. Вы ўбачыце, што атрымліваецца вельмі «круглая» лічба.

Па колькасці неплацельшчыкаў лідэрамі з'яўляюцца фізічны факультэт, механіка-матэматычны і факультэт прыкладной матэматыкі. А ў асабістым першынстве цвёрда лідзіруюць студэнты фізфака А. Шыркоў і В. Васілька, студэнтка гістарычнага факультэта Л. Гужава. Цікава, што пераважная колькасць парушальнікаў — пяцікурснікі. Праўда, другакурснік філалагічнага факультэта К. Шкленік здзівіў усіх. Год назад яму было прадастаўлена месца ў інтэрнаце, а ён... нават не ведаў аб гэтым. Дзіўна! Але хопіць пра гэты спіс.

...У студэнцкім царстве — восем хатак. І жыве ў ім народ жыццярадасны, няўрымслівы. Нават не прыкмячае «лыжку дзёгцю» даўжнікоў. А шкада, вельмі шкада...

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

**ТОЛЬКІ ФАКТ**

# САВЕТ ДРУЖБЫ

ПРАЙДЗІЦЕ ПА АЎДЫТОРЫЯХ універсітэта і вы міжволі зробіце кругасветнае падарожжа, пабываўшы на ўсіх кантынентах, больш чым у 80 краінах! Юнакі і дзяўчаты з гэтых краін займаюцца ў нашым універсітэце. Перад намі людзі, якія будуць вызначаць будучы твар планеты. У іх сілах зрабіць вельмі многае, каб агонь вайны ніколі не паявіўся на нашай планеце.

Штогод павялічваецца колькасць студэнтаў розных краін свету, якія займаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна. Гэта, зразумела, павялічвае аб'ём работы па інтэрнацыянальнаму выхаванню.

Пэўны вопыт па інтэрнацыянальнаму выхаванню ёсць і на гістарычным факультэце, на якім дзейнічае савет дружбы. Мэта яго — самае шырокае прыцягненне ў грамадска-палітычнае, навуковае і культурнае жыццё факультэта замежных студэнтаў.

Ці апраўдвае сваю гучную назву савет дружбы? А вы схадзіце на гістарычны факультэт і спытайце аб інтэррабоце ў нашых студэнтаў самі. Дадам толькі, што за 2 гады праведзена 18 факультэцкіх мерапрыемстваў з удзелам замежных студэнтаў.

2 снежня 1980 года ў інтэрнаце № 1 у 20 гадзін ў пакоі інтэрнацыянальнай дружбы адбудзецца чарговае пасяджэнне савета дружбы. Прыходзьце! Убачыце савет дружбы за работай.

**І. ВЕЛІЧАНСКІ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола гістарычнага факультэта.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**
**13 лістапада 1980 г.**
АТ 15494 Заказ 1681.

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19**

**Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ**